Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП(б)Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 59 (73) Нядзеля, 9 снежня 1945 г.

ПРАЦОЎНЫЯ РАЁНА! 10 ЛЮТАГА 1946 ГОДА ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ СССР. ШЫРЭЙ РАЗГОРНЕМ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ВЫБАРАЎ, А РАЗАМ З ТЫМ І ВЫКАНАННЕ НАРОДНА-ГАСПАДАРЧЫХ ЗАДАЧ, ЯКІЯ СТАЯЦЬ ПЕРАД НАМІ!

# Рашэнне

## Антопальскага Выканкома раённага Совета дэпутатаў працоўных ад 8 снежня 1945 года

## АБ СТВАРЭННІ ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАЎ ПА ВЫБАРАХ У СОВЕТ САЮЗА І СОВЕТ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

На падставе артыкулаў 27, 28, 29, 30 і 31 „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР“ Выканком Антопальскага райсовета дэпутатаў працоўных рашыў:

Зацвердзіць па Антопальскаму раёну наступныя 22 выбарчых участкі па выбарах у Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцей:

### г. АНТОПАЛЬ

**Совецкі выбарчы ўчастак № 23** (цэнтр—Дом соцкультуры).

**Кобрынскі выбарчы ўчастак № 24** (цэнтр—раённая бальніца).

**Гарадзецкі выбарчы ўчастак № 25** (цэнтр—Гарадзецкі сельскі совет).

Сюда ўваходзяць: мястэчка Гарадзец, чыгуначная станцыя і прылягаючыя да Гарадца хутары.

**Мехведавіцкі выбарчы ўчастак № 26** (цэнтр—Мехведавіцкая школа).

Вёскі: Мехведавічы, Малы Рудзец, Бальшы Рудзец з прылягаючымі хутарамі.

**Галоўчыцкі выбарчы ўчастак № 27** (цэнтр—Галоўчыцкі сельсовет).

Вёскі: Галоўчыцы, Дзятлавічы, Карсунь і ўсе прылягаючыя хутары.

**Дзеткавіцкі выбарчы ўчастак № 28** (цэнтр—Дзеткавіцкая школа).

Вёскі: Дзеткавічы, Каты, Рашэнь, Бобкі, Буды, Залессе, Дубавая, Меневеж, Новая Тэмра, Лавы, Ражок, Старая Тэмра.

**Дзераўноўскі выбарчы ўчастак № 29** (цэнтр—Дзераўноўскі сельсовет).

Вёскі: Дзераўная, Масткі, Татар'я, Сукачы, Тыневічы з усімі прылягаючымі хутарамі.

**Дзямідаўшчынскі выбарчы ўчастак № 30** (цэнтр—Дзямідаўшчынская школа).

Вёскі: Дзямідаўшчына, Падзяменне, Мазуры, Песчанка, Шуры, Адрынка, Асмолавічы з усімі хутарамі.

**Імснінскі выбарчы ўчастак № 31** (цэнтр—Заніўеўскі сельсовет).

Вёскі: Іменін, Уліца, Пацы, Брадок з усімі хутарамі.

**Заніўсўскі выбарчы ўчастак № 32** (цэнтр—Заніўеўская школа).

Вёскі: Заніўе, Зёлава, з прылягаючымі да іх хутарамі.

**Беразноўскі выбарчы ўчастак № 33** (цэнтр—дом селяніна Раманюк Еўціхія).

Вёска: Бярозна з прылягаючымі хутарамі.

**Іласкі выбарчы ўчастак № 34** (цэнтр—Іласкі сельсовет).

Вёскі: Іласк, Шэмятоўка, Павасёлкі, Лука, Смалярня, Калонія, Смедзін і прылягаючыя да іх хутары.

**Каменскі выбарчы ўчастак № 35** (цэнтр—Каменская школа).

Вёскі: Камень—Каралеўскі, Ліпава, Ліпнікі з прылягаючымі хутарамі.

**Гірскі выбарчы ўчастак № 36** (цэнтр—Гірская школа).

Вёскі: Гірск, Арол з прылягаючымі хутарамі.

**Акцябрскі выбарчы ўчастак № 37** (цэнтр—Акцябрскі сельсовет.

Вёскі: Камень-Шляхецкі, Варатынічы, Нятрэба-Рачкі з прылягаючымі хутарамі.

**Кустовіцкі выбарчы ўчастак № 38** (цэнтр—Кустовіцкая школа).

Вёска Кустовічы з прылягаючымі да яе хутарамі.

**Асіпавіцкі выбарчы ўчастак № 39** (цэнтр—Асіпавіцкі сельсовет).

Вёскі: Асіпавічы, Татарнавічы, Хамічыцы, Ямнік, Галік, Навасёлкі з усімі прылягаючымі хутарамі.

**Аніскавіцкі выбарчы ўчастак № 40** (цэнтр—Аніскавіцкая школа).

Вёскі: Аніскавічы, Добрае, Залескі, Забалоцце, Вялічкавічы, Дубіны, Соўплі, Жукі, Старадубцы, Меленкова, Выгода, Чэлішчавічы з усімі хутарамі.

**Першамайскі выбарчы ўчастак № 41** (цэнтр—Першамайскі селсовет).

Вёскі: Першамайск, Свеклічы, Гарыцы, Губерня, Вулька з усімі хутарамі.

**Толкаўскі выбарчы ўчастак № 42** (цэнтр—Толкаўская школа).

Вёскі: Толкава, Віры з усімі хутарамі.

**Худлінскі выбарчы ўчастак № 43** (цэнтр—Худлінскі сельсовет).

Вёскі: Худлін, Падлесее, Бародзічы з усімі хутарамі.

**Грушаўскі выбарчы ўчастак № 44** (цэнтр—Грушаўская школа).

Вёскі: Грушава, Лідзіопальскія хутары і МТС.

Старшыня выканкома раённага Совета дэпутатаў працоўных
**А. ЦАРЫКАЎ.**

Сакратар выканкома раённага Совета дэпутатаў працоўных
**Е. БАБРОЎ.**

# Совецкая выбарчая сістэма

У Сталінскай Канстытуцыі запісана, што выбары дэпутатаў у Советы дэпутатаў працоўных праводзяцца выбаршчыкамі на аснове ўсеагульнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

Совецкая ўлада—сапраўды народная ўлада. Усе грамадзяне Совецкага Саюза, дасягнуўшыя к дню выбараў 18 год маюць права выбіраць дэпутатаў, кожны грамадзянін СССР, дасягнуўшы 23 год можа быць выбраным у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР. Правам выбіраць і быць выбраным карыстаюцца ўсе грамадзяне Совецкага Саюза незалежна ад іх расавай і нацыянальнай прыналежнасці, полу, веравызнання, адукацыйнага цэнза, аселасці, сацыяльнага паходжання, маёмаснага становішча і мінулай дзейнасці. Гэтым правам не карыстаюцца толькі асобы, загубіўшыя рассудак і пазбаўленыя выбарчых праў па прыгавору суда.

У совецкай краіне няма класавых супярэчнасцей: у нас няма эксплаатататарскіх класаў. Інтарэсы рабочых, сялян і інтэлігенцыі ў нашай краіне адзіныя і пагэтаму ў нас не можа быць антаганізма паміж класамі і класавых абмежаванняў.

Партыя Леніна—Сталіна заўсёды праводзіла і праводзіць палітыку раўнапраўя нацыянальнасцей, Сталінская Канстытуцыя ўзаконіла гэта раўнапраўе. У баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы на працягу ўсёй гісторыі існавання совецкай улады сталінская дружба народаў прайшла праз усе выпрабаванні. З іх совецкі народ вышаў яшчэ больш згуртаваным вакол партыі Леніна—Сталіна. У нас не можа быць супярэчнасцей паміж нацыямі і нацыянальных абмежаванняў.

Сталінская Канстытуцыя прызнае за ўсімі грамадзянамі свабоду совесці, свабоду вядзення рэлігійных культаў і свабоду антырэлігійнай прапаганды.

Нашы выбары роўныя. Ніхто не мае ў нас ніякіх прывілегій ні па маёмасных, ні па другіх прызнаках. Жанчыны ў нас карыстаюцца ўсімі правамі нараўне з мужчынамі. Васнаслужачыя нараўне з усімі грамадзянамі карыстаюцца выбарчымі правамі. У многіх буржуазных краінах жанчыны і моладзь пазбаўлены выбарчых правоў, пазбаўлена выбарчых правоў таксама насельніцтва калоній, у той час як буйныя земляўладальнікі маюць па два і больш голасы.

У нас няма і не можа быць такіх абмежаванняў, як няма ні для каго ніякіх прывілегій. Усе грамадзяне СССР маюць права на адзін голас.

Нашы выбары тайныя. Совецкая выбарчая сістэма прадастаўляе совецкім людзям поўную свабоду галасаваць за сваіх кандыдатаў. У кабіну для галасавання ніхто не мае права ўходзіць, калі там знаходзіцца выбаршчык з бюлетэнем.

Нашы выбары прамыя. Выбары дэпутатаў працоўных пачынаючы ад сельскіх советаў і да Вярхоўнага Совета СССР праводзяцца непасрэдна ўсімі грамадзянамі. Усе грамадскія арганізацыі, грамадствы працоўных, комуністычныя партыйныя арганізацыі, прафсаюзы, кааператывы, арганізацыі моладзі, культурныя грамадствы маюць права выстаўляць сваіх кандыдатаў і весці перадвыбарную агітацыю за іх.

Совецкая выбарчая сістэма—самая дэмакратычная ў свеце. У ёй адзначаны ўсе гістарычныя заваяванні, якіх дабіўся наш народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна.

Мінулыя выбары ў Вярхоўны Совет СССР, якія праходзілі восем год назад, 12 снежня 1937 года—яркі прыклад велічы Сталінскай Канстытуцыі, згуртаванасці совецкага народа вакол партыі большэвікоў.

З 94 мільёнаў выбаршчыкаў у выбарах 1937 года прынялі ўдзел звыш 91 мільёна або 96,8 процанта. З іх за блок комуністаў і беспартыйных галасавала 89.844 тысячы чалавек, або 98,6 процанта. Усе кандыдаты блока комуністаў і беспартыйных былі выбраны. Гэта была выдатная перамога блока комуністаў і беспартыйных, перамога партыі большэвікоў.

10 лютага 1946 года мы будзем выбіраць зноў дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР. Совецкі народ, паказаўшы ў годы Айчыннай вайны сваю згуртаванасць вакол партыі Леніна—Сталіна, правядзе і гэтыя выбары дружна і арганізавана, выбраўшы ў Вярхоўны Совет СССР лепшых людзей нашай Радзімы.

І. Крыскавец.

## Палепшыць работу пякарні

У канторы райспажыўсаюза заўсёды можна бачыць многа людзей. Адны прыходзяць, каб атрымаць картачкі на хлеб, а другія проста з пытаннямі да старшыні спажыўсаюза т. Цітова: ці будзе ў магазіне хлеб. Цітоў ахвоча адказваць на запытанні. Ён запэўняе:

—Хлеб будзе і сёння і заўтры...

Але яго словам ужо перасталі верыць. У магазін хлеб павінен прывазіцца два разы ў дзень, але ён прывозіцца раз, а то і зусім няма. Спажыўцы па некалькі дзён не могуць атрымаць на картачку хлеба.

Трэба адзначыць, што выпечаны хлеб зусім нізкай якасці. Вось ужо з тыдзень ячменная мука не прасейваецца, і хлеб прадаюць з асцюкамі, паловай.

Гэта тлумачыцца тым, што работнікі пякарні (загадчык т. Лок) неўважліва і безадказна адносяцца да даручанай работы.

Спажыўсаюзу неабходна сур'ёзна заняцца паляпшэннем работы пякарні і рэгулярна забяспечваць насельніцтва хлебам.

П. Ветка.

В.а. рэдактара
П. СПІРЫДОНАЎ

ГЛ 14880 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Совецкая вуліца, дом № 1.